Нацыянальны інстытут адукацыі

**Кампетэнтнасны падыход**

**І. А. Пінголь**

# Беларуская літаратура

# 10

клас

## Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы

(базавы і павышаны ўзроўні)

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мазыр
«Выснова»
2021

# ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## ДА РАЗДЗЕЛА «ДАЎНЯЯ ЛІТАРАТУРА (XI—XVIII СТАГОДДЗІ)»

### *Заданне 1*

Дапоўніце кластар «Жанры літаратуры Сярэдневякоўя». Прывядзіце прыклады твораў кожнага жанру.




* Патлумачце, чаму літаратуру Сярэдневякоўя называюць «літаратурай схемы» і ў чым праяўляецца такая яе рыса, як сінкрэтызм.

### *Заданне 2*

Кірылу Тураўскага сучаснікі называлі «*Златавуст, паче всех воссиявшим на Руси (Златавуст, што больш за ўсіх праззяў на Русі)*».

Як вы разумееце слова «златавуст»?

Выпішыце з тэксту «Слова на Вялікдзень» прыклады вобразна-выяўленчых сродкаў, якія раскрываюць рысы творчай манеры Кірылы Тураўскага — мастака слова.

* — заданні, якія рэкамендуюцца для павышанага ўзроўню вывучэння прадмета.

| | |
|---|---|
| Эпітэты | |
| Метафары | |
| Разгорнутыя параўнанні | |
| Воклічы і звароты | |

Прывядзіце тры доказы таго, што «Слова на Вялікдзень» Кірылы Тураўскага належыць да літаратуры эпохі Сярэдневечча.

### *Заданне 3*

Уявіце, што вам з групай аднакласнікаў неабходна распрацаваць міні-праект па адной з прапанаваных тэм:

- «Эпоха тытанаў духу» (асаблівасці эпохі Адраджэння, знакамітыя культурныя дзеячы);
- «Пуцявіны Францыска Скарыны» (жыццёвы і творчы шлях Скарыны);
- «Скарына — першадрукар, пісьменнік, мысліцель» (агульначалавечы пафас творчасці Скарыны);
- «Будучае Беларусі — старажытныя кнігі Скарыны» (значэнне дзейнасці Францыска Скарыны).

Выберыце адну з тэм і складзіце план, які будзе раскрываць змест вашага праекта.

### *Заданне 4*

Прачытайце прыведзеныя ніжэй урыўкі з прадмоў Францыска Скарыны, звяртаючы ўвагу на сродкі мастацкай выразнасці (тропы, рытарычныя фігуры, асаблівасці сінтаксісу). Дакажыце, што Скарына быў не толькі выдатным асветнікам, але і пісьменнікам.

Біблія дзецям і людзям простым — кніга для навучання, настаўнікам і людзям мудрым — для захаплення. Біблія — дзівосная рака! Яна бывае мелкай, і нават авечка можа перайсці! Але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці цераз яе! У гэтай кнізе — пачатак і канец усёй існуючай мудрасці, бо толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-ўсетрымальніка! У гэтай кнізе — усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі ў зямным жыцці! У гэтай

кнізе — усе лякарствы душэўныя і цялесныя разам знойдзеце! Тут — навучанне філасофіі дабранраўнае: як Бога любіць для самога сябе і для бліжняга свайго! Тут — справа ўсялякага збору людскога і гораду, якія праз веру, ласку і згоду паспалітую дабро памнажаюць. Тут — поўнае навучанне сямі навук вызваленых! (*З прадмовы да ўсёй Бібліі*).

...псалмы — гэта скарб, безліч каштоўных каменняў! Яны розную немач духоўную і цялесную выганяюць! Душу і розум прасвятляюць! Гнеў і лютасць уціхамірваюць! Мір і пакой чыняць! Смутак і скруху адганяюць! Пачуцці ў малітвах даюць! Людзей зычлівымі робяць! Ласку і міласць мацуюць! Д'ябла праганяюць, анёлаў па дапамогу заклікаюць! Псалом — гэта шчыт супраць начных д'ябальскіх спакус і страхаў! Пакой у дзённай мітусні і беганіне! Абарона і вяселле малым, пацеха і песня старым! Жонкам — набожная малітва і ўкраса! Дзецям малым — пачатак усялякае добрай навукі, юнакам — памнажэнне іх ведаў, мужам — умацаванне вялікае! Псалом святочна ўпрыгожвае голас усёй адзінай царквы! Псалом усялякую супраціўнасць дзеля Бога выпраўляе! Псалом жорсткае сэрца змякчае і слёзы яго, як струменьчык з крыніцы, выводзіць. Псалом — анёльская песня, духоўны тэмпан, які цела спевамі весяліць і адначасна душу вучыць! Чаго толькі не знойдзеш у псалмах!.. Ведаючы такія пажыткі ад гэтае кнігі, я, Францішак, Скарынін сын з Полацка, у лекарскіх навуках доктар, загадаў «Псалтыр» цісснуці рускімі словамі славянскае мовы. Найперш — для ўшанавання і хвалы Бога ў Тройцы адзінага і Прачыстай маці яго Марыі, і ўсіх нябесных чыноў, і святых божых. А таксама — для карысці паспалітага люду. І асабліва з тае прычыны, што мяне літасцівы Бог з гэтае мовы на свет пусціў... (*З прадмовы да «Псалтыра»*).

### *Заданне 5**

Уявіце, што на пасяджэнні дэбатнага клуба вам неабходна падрыхтаваць выступленне ў пацверджанне слоў знакамітага італьянскага дзеяча эпохі Адраджэння Леона Батыста Альберці «Чалавек нараджаецца не дзеля таго, каб сумна і бяздзейна існаваць, а каб рабіць вялікую і грандыёзную справу». Абапіраючыся на факты з жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, складзіце тэзісны план свайго выказвання.

### *Заданне 6**

У XVI стагоддзі ў старабеларускай літаратуры зарадзілася свецкая кніжная паэзія, у якой адно з важных месцаў займалі панегірычныя жанры, гэтак званыя «эпіграмы», што суправаджалі выявы гербаў славутых магнатаў і гарадоў. Прачытайце прыведзены ніжэй тэкст вядомага літаратуразнаўцы Івана Саверчанкі, вызначце ў тэксце ключавыя, на вашу думку, характарыстыкі гэтых твораў.

Сутнасць «эпіграм» на гербы ўва ўсёй эмблеме пераважна зводзілася да таго, каб раскрыць сімвалічную ўзаемасувязь паміж знакамі герба і справамі прадстаўнікоў славутага роду. Аднак, нягледзячы на тое, што перад усімі складальнікамі «эпіграм» стаялі агульныя задачы, творчыя магчымасці паэтаў не абмяжоўваліся. Хутчэй нават наадварот — гэта натхняла іх на пошукі непаўторных, каларытных і запамінальных вобразаў. Каб дасягнуць арыгінальнасці, паэты выкарыстоўвалі самыя разнастайныя мастацкія сродкі: параўнанні, метафары, прыпадабненні, алегорыі, сімвалы і г. д. Асабліва часта ў «эпіграмах» апісваліся кантрастныя з'явы, чым дасягалася стварэнне па-мастацку выразных карцін і вобразаў. Жанраўтваральны пачатак «эпіграмы» — матыў слаўлення, захаплення і здзіўлення веліччу ды значнасцю з'явы, пра якую апавядалася. Галоўная каштоўнасць «эпіграмы» на фамільныя гербы ў тым, што ў іх знайшлі найбольш поўнае выражэнне пошукі новых літаратурна-мастацкіх сродкаў. Творча пераасэнсоўваючы традыцыйныя шляхі адлюстравання рэчаіснасці, беларускія паэты асноўную ўвагу аддавалі не пошуку новых тэм і прадметаў, а стварэнню арыгінальных спалучэнняў з тымі, што ўжо меліся, выкарыстоўваючы пры гэтым падкрэслена мудрагелістыя сродкі мастацкага абагульнення.

### *Заданне 7**

Прачытайце ўрывак з верша Андрэя Рымшы «На гербы Льва Сапегі» і прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць слушнасць меркавання Івана Саверчанкі, прыведзенага ў папярэднім заданні.

Хочеш же ся присмотреть, гербомъ праве значным.
За раз можеш познати, иж суть в дому зацным.
Зъ давна славныхъ Сапеговъ, тые зъ предковъ своихъ,
Заквитывали въ цнотахъ, знать во лилиях троих.
При которихъ зъ оружъемъ, конъный воин стоить,

Знакомъ того иж ся з нихъ, ни одинъ не боить.
Служить своимъ сподарем, ку кождой потребе,
Не литуючи скарбовъ, ни самого себе.
Къ тому видишь якъ въ локоть, пострелена рука,
Видишъ ижъ въ скрозь изъ туга, з прострелного лука,
Таки пострелъ никого дома не потькаеть,
Одно хто поганьские, польки розрываеть.
Въ тыхъ же геръбехъ посредку, есть стрела зъ крестами
Двема, а третий блиско, осажономъ лунами.
Тые знакомъ ижъ они, больш для Хрестианства
Клали здоровье свое, несмотречы паньства.
Смотри жъ вышей узриш тамъ, надъ гельмом коруну,
Которая даеть знать, ижъ тамъ Бог фортуну,
И цноту съ сильнымъ мужъствомъ сполне коронует,
Чого у них ани моль, ни ржа не попсует.
Живете жъ Сапегове, вси въ многие лета,
Ваша слава слыть будеть, покуль станеть света.
Подавайте жъ потомъком, што маете зъ предъков,
Ведже и вашихъ цныхъ справъ, въ весь свет полон светков.

### *Заданне 8**

Палемічныя творы пачатку XVII стагоддзя з'яўляюцца адной з найбольш яркіх старонак літаратуры барока. Вызначце на аснове прыведзеных ніжэй твораў характэрныя рысы гэтага мастацкага напрамку ў літаратуры. Назавіце твор і яго аўтара.

Гора мне беднай, гора няшчаснай, ах, з усіх бакоў з маіх уладанняў абрабаванай! Гора мне на свецкае асмяянне аголенай, з якой сцягнуты шаты! Гора мне, нязносным цяжарам апанаванай! Рукі ў аковах, ярмо на шыі, путы на нагах, ланцуг на бёдрах, меч над галавою абасечны, вада пад нагамі глыбокая, агонь на баках незгасальны — адусюль крыкі, адусюль страх, адусюль праследванні! Бяда ў гарадах і весях, бяда ў палях і дубровах, бяда ў гарах і зямных бяздоннях! Няма ніводнага месца спакойнага ці надзейнага прытулку! Дзень у пакутах і ранах, ноч у стогнах і ўздыханнях! Спякотнае лета пазбаўляе мяне прытомнасці, лютая зіма даводзіць да смерці, бо бездапаможна цярплю галізну і да смерці бываю праследаванай. Раней чароўная і багатая, цяпер знявечаная і ўбогая! Некалі каралева, якую кахаў увесь свет, цяпер жа ўсімі адвергнутая і засмучаная! Падыдзіце да мяне ўсе, хто жывы, усе народы, падыдзіце, усе грамадзяне зямлі, паслухайце майго голасу і спазнайце, чым я была раней, і падзівіцеся!

### *Заданне 9*

«Прамова Мялешкі» прадстаўляе шырокую панараму новых звычаяў, нораваў, «завядзёнак», якія пярэчаць старасвецка-сармацкаму ладу жыцця беларускай шляхты, уяўленням пра добрага караля і яго ўладу. Выпішыце сатырычныя сродкі, якімі карыстаецца аўтар, ствараючы вобразы ў творы.

| | |
|---|---|
| Аўтарскія каментарыі падзей | ... |
| Каларытная народная мова | ... |
| Параўнанні | ... |
| Прыказкі, трапныя выслоўі | ... |

Вызначце ідэю, якая ляжыць у аснове твора «Прамова Мялешкі».

### *Заданне 10**

Дакажыце, абапіраючыся на тэкст, што «Ліст да Абуховіча» можна лічыць фельетонам.

*Фельетон* (*франц. feuilleton, от feuille — ліст, лісток*) — жанр мастацка-публіцыстычнай літаратуры, якому ўласцівы крытычны, нярэдка камічны ці сатырычны пачатак. Яго агульныя рысы — актуальнасць прадмета гаворкі ці разважання, нязмушанасць кампазіцыі, парадзійнае выкарыстанне мастацкіх і пазамастацкіх жанраў і стыляў.

Што збліжае гэты твор з «Прамовай Мялешкі» ў ідэйным і мастацкім плане?

# ЗМЕСТ

Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні дыдактычных і дыягнастычных матэрыялаў . . . 3
Умоўныя абазначэнні . . . 7

**ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

Да раздзела «Даўняя літаратура (XI—XVIII стагоддзі)» . . . 8
Да раздзела «Развіццё новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя» . . . 14
Да раздзела «Шляхі развіцця беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» . . . 16

**ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ**

Да раздзела «Даўняя літаратура (XI—XVIII стагоддзі)» . . . 24
Да раздзела «Развіццё новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя» . . . 27
Да раздзела «Шляхі развіцця беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя» . . . 28

*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . 43